

ТБ ДА ДЗЁН МАЦІ І БАЦЬКІ

5

АД НАВАЛЬНІЦ ДА МОКРАГА СНЕГУ

16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

13 КАСТРЫЧНІКА 2023 г. ПЯТНІЦА № 199 (30079)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ПІШЧОЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Мінадукацыі:**

*«Міністэрства адукацыі прапрацоўвае нарматыўнае замацаванне ў падыходах па накіраванні на першае месца работы выпускнікоў платнай формы навучання. Такая практыка не з'яўляецца новай, на працягу шэрагу гадоў такі вопыт ёсць у выпускнікоў медыцынскіх універсітэтаў, якія апроч асноўнага навучання праходзяць інтэрнатуру для таго, каб атрымаць пэўныя практычныя навыкі і дадатковыя прафесійныя кампетэнцыі для паспяховага далейшага працаўладкавання і атрымання сваёй прафесіі. Накіраванне на першае месца працы выпускнікоў сёння неабходна разглядаць як практыка-арыентаваны працяг навучання, але ўжо на працоўным месцы. Гэта дае магчымасць забяспечыць паспяховае ўваходжанне ў прафесію, набыццё практычных і прафесійных кампетэнцый і навыкаў. Мяркуем, што аптымальны тэрмін для рашэння дадзенай задачы — не менш за два гады з выкарыстаннем інстытута настаўніцтва, гэта значыць з прыцягненнем вопытных работнікаў».*

## КОРАТКА

- **Адзіны ўрок «Цяпло бацькоўскай душы» пройдзе ва ўсіх школах Беларусі 18 кастрычніка.**
- У краіне накапана больш за 680 тыс. тон бульбы.
- **Сезон палявання на зайца стартаваў у Беларусі.**

ISSN 1990 — 763X

# ПАСЛАННЕ Ў БУДУЧЫНЮ

## У гонар 95-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў Мінску адкрылася архітэктурна-мастацкая кампазіцыя «Залатое кольца беларускай навукі»





Кампазіцыя ўяўляе сабой ратонду са скульптурамі вядомых беларускіх вучоных усіх часоў. Акрамя таго, тут сярод вобразаў выдатных розумаў краіны была закладзена капсула з пасланнем нашчадкам, якую адкрыюць праз 50 гадоў (яе трымае ў руках Старшыня прэзідыума НАН Уладзімір ГУСАКОЎ).

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

З нагоды

**Валерый КАВАЛЬКОЎ:**

## «Выбудаваная сістэма падтрымкі сем'яў — нацыянальны здабытак»

**У гэту суботу ў Беларусі адзначаецца Дзень маці. А праз тыдзень, 21 кастрычніка, святочныя пажаданні будуць гучаць у гонар тат. Напярэдадні свят спецыялісты расказалі, як змянілася сістэма падтрымкі сем'яў і якія працоўныя гарантыі ўнесены ў Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь.**



### Самыя шматдзетныя — Брэстчына і Міншчына

— Бацькоўства — вялікая праца. А ад маці і ад бацькі ў роўнай ступені залежыць дабрабыт не толькі сям'і і дзяцей, але і ўсёй краіны, якой яна будзе праз дзесяцігоддзі. Менавіта таму наша краіна актыўна выступае за абарону сям'і і сямейных каштоўнасцяў, — адзначыў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ**.

Ён нагадаў, што ў краіне забяспечваецца матэрыяльная падтрымка пры нараджэнні і выхаванні дзяцей. Аказваецца дапамога ў вырашэнні жыллёвых пытанняў шматдзетным сем'ям і маладым сем'ям з двума дзецьмі.

— Выбудаваная сістэма — сапраўды нацыянальны здабытак, і з гадамі мы прымнажаем яе, — падкрэсліў намеснік міністра.

СТАР. 3

Лічбавы свет

## Тэхналогіі, здольныя змяніць наша жыццё

### У НАН прадставілі асноўныя ІТ-трэнды

**Штучны інтэлект — той кірунак, які найбольш імкліва развіваецца ва ўсім свеце. Ён стаў новым фактарам, які вызначае вектары грамадскага развіцця. Яго прымяненне пашыраецца ва ўсіх сферах жыццядзейнасці: ад бытавой тэхнікі, медыцыны, прамысловых вытворчасцяў да касмічных станцый. Ключавыя напрамкі развіцця штучнага інтэлекту — камп'ютарны зрок, распазнанне маўлення, разуменне сэнсу тэкстаў, аналітыка і падтрымка прыняцця рашэнняў, алічбаваныя прадпрыемствы.**

**Учора ў Нацыянальнай акадэміі навук адкрылася выстаўка-форум ІТ-Акадэмгорада «Штучны інтэлект у Беларусі». Ён аб'яднаў каля 50 арганізацый краіны, якія прадставілі ўвазе гасцей больш як 100 сваіх праектаў.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

СТАР. 4

# РАБОЧЫ ВІЗІТ У КЫРГЫЗСТАН

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з рабочым візітам у Кыргызскую Рэспубліку, у сталіцы якой, Бішкеку, сёння адбудзецца пасяджэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, паведамляе БелТА.**

Мерапрыемства традыцыйна пройдзе ў вузкім і пашыраным саставах. Кіраўнік дзяржавы прадставіць пазіцыю і прапановы Беларусі па найбольш актуальных пытаннях узаемадзеяння ў рамках Садружнасці.

Чакаецца, што лідары краін СНД прымуць шэраг сумесных заяў.

На пашырэнне патэнцыялу Садружнасці і павышэнне яго ролі на міжнароднай арэне накіравана пытанне парадку дня аб заснаванні статусаў наглядальніка і партнёра СНД.

Запланавана таксама ўнясенне шэрагу змяненняў у прававыя акты СНД, абмеркаванне пытанняў актуальнай праблематыкі па шырокім спектры тэм.

На палях саміту будуць абмяркоўвацца і пытанні двухбаковага супрацоўніцтва паміж краінамі — у ходзе сустрэч, перагавораў і ўзаемадзеяння кіраўнікоў дзяржаў.

Напярэдадні саміту ў Бішкеку прайшло пасяджэнне Савета Міністраў замежных спраў (СМЗС) краін СНД. Ад беларускага боку ў ім прыняў удзел кіраўнік МЗС Сяргей Алейнік.

СМЗС адобрыў чатыры праекты сумесных заяў Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД. Сярод іх — праект Заявы аб прынцыпах міждзяржаўных адносін у шматпалярным свеце. Як інфармуе прэс-служба Выканкама СНД, на саміце 13 кастрычніка таксама плануецца падпісаць шэраг дагавораў і пагадненняў.

Таксама чакаецца, што кіраўнікі дзяржаў СНД прымуць рашэнне аб аб'яўленні Самарканда (Рэспубліка Узбекістан) Культурнай сталіцай Садружнасці ў 2024 годзе.

Актуальна

# Нашы сямейныя каштоўнасці

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА і мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН, Патрыяршы Экзарх усёй Беларусі, правялі сустрэчу са шматдзетнымі сем'ямі з усёй краіны. Месцам адкрытага дыялогу ўлады і бацькоў стаў Полацк. Мерапрыемства прайшло з мэтай умацавання статусу сям'і і сямейных каштоўнасцяў у Рэспубліцы Беларусь.**





Для галоўных герояў сустрэчы — бацькоў, якія выхоўваюць трох і больш дзяцей і з'яўляюцца прыкладамі, на якіх трэба раўняцца, — зладзілі аглядавую экскурсію па горадзе — калысцы нашай дзяржаўнасці і Полацкім Спаса-Ефрасіннеўскім жаночым манастыры. Круглы стол, у якім узялі ўдзел 14 сем'яў з шасці абласцей і Мінска, адбыўся ў Музеі кнігадрукавання.

У пачатку адкрытага дыялогу Наталля Іванаўна адзначыла, што 11 кастрычніка ўсе члены Савета Рэспублікі правялі прамыя тэлефонныя лініі, большасць зваротаў грамадзян датычылася традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, у тым ліку была ўнесена прапанова прапісаць у Канстытуцыі, што шлюб магчымы толькі паміж мужчынам і жанчынай. А адзін чалавек, які звярнуўся на прамую лінію да Старшыні верхняй палаты парламента, унёс прапанову на дзяржаўным узроўні ўшаноўваць сямейныя пары, якія пражылі разам 50 і больш гадоў, бо сёння такая з'ява ў нашай краіне, на жаль, рэдкасць.

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усёй Беларусі, расказаў, што фарміраванне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў і ўсведамленне сям'і як фундаментальнай асновы грамадства ў дзяцей закладваюцца яшчэ ў школе. З гэтай мэтай прадстаўнікі царквы праводзяць з вучнямі духоўную работу ў рамках факультатыўных заняткаў, Школы актыўнага грамадзяніна. Аднак пэўную работу трэба праводзіць і па палавым выхаванні, у аснове якога павінны стаяць каханне, павага і вернасць.

«Што важна цяпер для бацькоў? Каб іх дзеці былі сумленнымі і годнымі людзьмі, цанілі і паважалі сваіх бацькоў. Сёння назіраецца тэндэнцыя хамства маладога пакалення ў адносінах да дарослых людзей, і гэта сапраўды бяда, калі сціраюцца межы разумення. Накіраваць дзяцей на правільны шлях — наша агульная задача, у тым ліку і педагогаў, якія павінны не толькі вучыць, але і выхоўваць», — падкрэсліла Наталля Качанава.

На сустрэчы сем'і дзяліліся сваімі гісторыямі, цікавіліся выкарыстаннем сямейнага капіталу, прапаноўвалі метады прыцягнення моладзі да духоўнага стаўлення і актыўнай грамадскай дзейнасці. А сям'я Нікіціных з Гомельскай вобласці ўнесла прапанову адзначаць на дзяржаўным узроўні ордэнамі не толькі матуль, але і шматдзетных тат, якія робяць не менш важкі ўнёсак у фарміраванне сям'і, а некаторыя ўвогуле выхоўваюць дзяцей адны. Такіх сем'яў, дарэчы, у нашай краіне 53 тысячы.

Напрыканцы сустрэчы сем'ям былі ўручаны падзякі і кветкі. Сёння святочныя мерапрыемствы напярэдадні Тыдня бацькоўскай любові ў Полацку працягваюцца. «Размова аб галоўным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава» з удзелам Старшыні Савета Рэспублікі, сем'яў, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый сабрала ў старажытным горадзе каля 250 чалавек.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

Векапомнае

# Адстаяць праўду і захаваць памяць

## Якія пытанні абмяркоўваліся на форуме «Гісторыя для будучыні. Расія і Беларусь»

**У супрацьстаянні шматлікім выклікам сучаснасці і антыгуманістычнай ідэалогіі Захаду Беларусь і Расія прытрымліваюцца адзінай пазіцыі. Беларусы і расіяне ніколі не дапусцяць апраўдання злачынстваў нацыстаў, не дазволяць абясцэніць Перамогу Савецкага Саюза ў Другой сусветнай вайне, на працягу многіх дзесяцігоддзяў будуць захоўваць памяць аб трагедыі, якая ў 1941—1944 гадах напаткала нашы народы.**

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыўся міжнародны форум «Гісторыя для будучыні. Расія і Беларусь», заклікаmake садзейнічаць умацаванню супрацоўніцтва нашых краін у справе захавання агульнай гісторыі і культурных каштоўнасцяў. Асаблівая ўвага — асветніцкай рабоце з моладдзю. Арганізатарамі форуму выступілі Расійскае ваенна-гістарычнае таварыства сумесна з Беларускім таварыствам «Веды» пры падтрымцы Рассупрацоўніцтва і Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

### «Не дазволім замахвацца на адзінства і спадчыну славянскага роду»

Прывітанне ўдзельнікам і гасцям міжнароднага форуму «Гісторыя для будучыні. Расія і Беларусь» накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Нашы краіны разам адстойваюць нацыянальную ідэнтычнасць і захоўваюць памяць продкаў, нягледзячы на адкрытыя і нічым не прыкрытыя спробы навязаць нам чужыя ідэалы і каштоўнасці, — гаворыцца ў прывітанні. — Тысячагадовы шлях да набыцця дзяржаўнасці і вопыт перажытых выпрабаванняў навучылі беларусаў і расіян заўсёды памятаць. Мы ніколі і нікому не дазволім нас павучаць і замахвацца на адзінства і спадчыну славянскага роду».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што выкрыццё несапраўдных фактаў, папаўненне невядомых і асэнсаванне спрэчных старонак агульнага летапісу, масавая асветніцкая работа з'яўляюцца галоўнымі задачамі для патрыятычных сіл, а таксама навуковай, культурнай і медыясупольнасцяў дзвюх краін. «Упэўнены, форум стане эфектыўнай пляцоўкай для міжнароднага дыялогу па пытаннях папулярызацыі аргументаванай гістарычнай праўды ў грамадскай свядомасці», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён выказаў удзячнасць арганізатарам гэтага мерапрыемства і ўсім, хто захоўвае для будучых пакаленняў чысціню і веліч гісторыі брацкіх народаў.

### Будучыня — на традыцыях пераможцаў

Як звярнуў увагу **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар ЛУЦКІ**, беларускія і расійскія вучоныя дастаткова шчыльна працуюць па тэме агульнай гістарычнай памяці. Ён расказаў, што плённа ўзаемадзейнічаюць адміністрацыі прэзідэнтаў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, нагадаў, што ў 2022 годзе ў нашай краіне распараджэннем кіраўніка дзяржавы быў створаны Савет па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта. Пры гэтым Ігар Луцкі заўважыў, што да гэтага моманту такія рашэнні не прымаліся, бо гісторыя трактавалася ў зручным фармаце для ўсіх. Вострыя моманты і падыходы нашых заходніх суседзяў, па яго словах, выявіла абвастрэнне геапалітычнай абстаноўкі.

«Абарона гістарычнай памяці і пабудова нашай будучыні на той агульнай гістарычнай памяці, якая ёсць у Расіі і Беларусі, — вельмі важныя, — перакананы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — Важна не толькі даносіць гэта да моладзі. Трэба больш уважліва ставіцца да прэсы, якая працуе на тэрыторыі Беларусі і Расіі, у частцы інтэрпрэтацыі некаторых гістарычных падзей. Трэба ўважліва паглядзець на выдавецкія праекты, якія рэалізоўваюцца на тэрыторыі дзвюх краін. Цяпер мы вельмі ўважліва сочым за гэтым. Але скажу так: да пэўных падзей, на мой погляд, трактоўка ў тым ліку і тэмы Вялікай Айчыннай вайны, калі мякка сказаць, была своеасаблівай. Мне здаецца, што гэта ключавы пункт — Вялікая Айчынная вайна — для разумення і асэнсавання будучыні нашых народаў. І думаю, што ад тых традыцый, закладзеных нашымі воінамі, пераможцамі, мы і павінны адштурхоўвацца, будуючы нашу будучыню».

### Наступальная дзейнасць у гісторыі

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Барыс ГРЫЗЛОЎ** назваў форум знакавай падзеяй для Саюзнай дзяржавы. Ён звярнуў увагу на сур'ёзны склад удзельнікаў: дзяржаўныя дзеячы, вучоныя, публіцысты. Усё гэта, па яго словах, стала магчымым дзякуючы супрацоўніцтву Расійскага ваенна-гістарычнага таварыства і Беларускага таварыства «Веды».

«Захад перакручвае гісторыю, спрабуе выставіць яе ў патрэбным ключы і пераводзіць у палітычную плоскасць, — адзначыў Барыс Грызлоў. — Мы з гэтым пастаянна сутыкаемся. Напрыклад, ёсць спробы адмаўлення ролі Савецкага Саюза ў перамозе над нацызмам. Грунтуючыся на гэтым, нашы праціўнікі спрабуюць змяніць склад Савета Бяспекі ААН. Зразумела, гэтыя спробы не пройдуць, але яны ёсць. Аналагічныя дзеянні праціўнікі ажыццяўляюць у адносінах да іншых краін, не толькі да Беларусі і Расіі. Чаго варты прэцэдэнт у Канадзе, калі прэзідэнт Украіны і прэм'ер-міністр Канады стоячы віталі нацысцкага злачынцу. У яго рукі па локаць у крыві, ён удзельнічаў і ў забойстве людзей у канцлагерах, і ў спаленні вёсак».

Пасол падкрэсліў, што сёння свет пераварочваецца і калектыўны Захад спрабуе аваладаць сітуацыяй. «Нам трэба перашкаджаць гэтаму, наша дзейнасць у галіне гісторыі павінна быць наступальнай», — канстатаваў ён.

### Разам супрацьстаяць ціску і інсінуацыям

**Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ** перакананы ў тым, што форум стане змястоўным крокам і ўкладам у вялікую работу, якая вядзецца расійскім і беларускім бакамі па фарміраванні погляду на наша адзінае мінулае, якое робіць нас мацнейшым і пераконвае ў тым, што мы стагоддзямі ідзём разам крок за крокам. «Асаблівае значэнне маюць пазіцыі Уладзіміра Пуціна і Аляксандра Лукашэнкі па абароне гістарычнай праўды аб Вялікай Айчыннай вайне, — удакладніў ён. — Мы бачым тую павагу, якую праяўляюць прэзідэнты да салдат Перамогі, партызанаў і працаўнікоў тылу. Для ўсіх нас гэта наказ і даручэнне — вельмі дакладна і ўважліва займаць пазіцыю ў абарону таго, што здзейснена старэйшымі пакаленнямі, а таксама разам супрацьстаяць таму ціску, тым інсінуацыям і спробам зняваг, якія выяўляюцца ў адносінах да Беларусі і Расіі».

Дзмітрый Мезенцаў распавёў, што ў рамках новага праекта «Бібліятэка Саюзнай дзяржавы» выдадзены ўжо дзве кнігі аб укладзе беларускіх палкоў у Перамогу над Напалеонам і аб відавочных фактах гераізму беларускага народа — абаронцах Ленінграда і Ленінградскай вобласці. «Мы рыхтуем цяпер новыя праекты, прысвечаныя Сімяону Полацкаму, Францыску Скарыну, Міхаілу Ламаносаву — тым асветнікам, якія фарміравалі нашу адзіную славянскую цывілізацыю, — паведаміў дзяржсакратар. — Гэтым мы падкрэсліваем адзінства духоўнай і культурнай традыцыі».

### Час гістарычнай дыпламатыі

Паралелі з датай 12 кастрычніка, калі праводзіцца форум, правёў **старшыня рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Веды», генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім ГІГІН**. «12 кастрычніка 1943 года, роўна 80 гадоў таму, на беларускай зямлі пад Горкамі адбылася бітва першай пяхотнай дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі будучага Войска Польскага, — прыгадаў ён. — Мы памятаем пра гэтых палякаў, якія змагаліся побач з нашымі продкамі, вызвалялі Беларусь. Мы памятаем пра Грунвальд, дзе мы разам супрацьстаялі тэўтонскім рыцарам. Памятаем пра 27 тысяч славакаў, якіх гналі на забой на Усходні фронт, але яны перайшлі на бок Чырвонай Арміі. І мы ведаем, што ёсць палякі, якія прыехалі да нас, нягледзячы на ўсе перашкоды».

Вадзім Гігін заўважыў, што ў Еўропе засталіся палітыкі, якія клапоцяцца аб нацыянальных інтарэсах уласнага народа. «У Венгрыі ёсць Віктар Орбан, — канкрэтызаваў ён. — Ужо колькі гістарычных крыўд венгры маглі ўспомніць, але ён разумее, што гісторыя не павінна раз'ядноўваць — яна павінна аб'ядноўваць. Цяпер надыходзіць час гістарычнай дыпламатыі. Гісторыя павінна аб'ядноўваць народы. Гэта залог нашай перамогі. Для нас гісторыя — гэта любоў, сіла і наша мінулае».

**Вераніка КАНЮТА.**

# «Выбудаваная сістэма падтрымкі сем'яў — нацыянальны здабытак»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У першую чаргу сістэма дзяржаўнай падтрымкі накіравана на шматдзетныя сем'і. З 2020 года пашырана праграма сямейнага капіталу, цяпер гэтыя сродкі можна выкарыстоўваць датэрмінова. Гэта дазволіла маладым сем'ям, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, паскорыць вырашэнне гэтага пытання.

У Беларусі жыве больш за 123 тысячы шматдзетных сем'яў, у якіх выхоўваецца звыш 400 тысяч дзяцей. Самымі шматдзетнымі традыцыйна з'яўляюцца Брэсцкі рэгіён і Мінская вобласць. Тут жывуць і самыя вялікія сем'і, дзе выхоўваецца па 13 дзяцей. Праграмай сямейнага капіталу ўжо скарысталася 131 тысяча шматдзетных сем'яў. Больш за 74 тысячы з іх атрымалі гэтыя сродкі як часткова, так і цалкам для вырашэння сваіх пытанняў.

З 2022 года пашыраны працоўныя гарантыі для бацькоў. Гэта і водпуск для тат, і дыстанцыйная занятасць, распаўсюджанне шэрагу гарантый, прадугледжаных для маці і тат. Напрыклад, працоўны водпуск у летні час для мужчын, якія выхоўваюць дзіця-інваліда. А таксама права атрымаць водпуск да заканчэння шасці месяцаў працы ў наймальніка, калі ў таты двое дзяцей да сямнаццаці гадоў.

З 2021 года актыўна пашыраюцца паслугі для сем'яў, дзе маюцца дзеці з інваліднасцю 1-й і 2-й групы, у прыватнасці, для іх павялічылі перыяды прадстаўлення паслуг нянькі і сацыяльнай перадышкі. Былі пашыраны пенсіённыя гарантыі для маці: да 12 гадоў павялічаны перыяд догляду дзяцей, які залічваецца ў стаж для прызначэння пенсіі. Да 10 гадоў быў зніжаны неабходны страхавы стаж маці, якія нарадзілі і выхавалі чатырох дзяцей.

Сёлета дзякуючы зменам у Працоўны кодэкс пашырыліся гарантыі бацькам, якія маюць трое і больш дзяцей ці выхоўваюць дзіця-інваліда. Са студзеня 2024 года ў іх з'явіцца магчымасць выбраць, як выкарыстаць вольны ад работы час. Замест вольнага дня на тыдзень работнік зможа скараціць працоўны дзень на адну гадзіну.

Замацаваны новыя падыходы да дыстанцыйнай работы. Цяпер яна можа быць не толькі пастаяннай, але і часовай — да шасці месяцаў у каляндарным годзе, а таксама чаргавацца з працай дыстанцыйна і на рабочым месцы.

— Прыцягненне наймальнікаў да стварэння спрыяльных умоў для выканання бацькоўскіх і прафесійных абавязкаў з'яўляецца важнай задачай. З 2021 года намі ініцыяваны праект «Кампанія, сяброўская бацькам», калі на прадпрыемстве ствараюцца спрыяльныя ўмовы і падтрымліваецца адпаведная карпаратыўная культура. Сёння ў нас 17 актыўных арганізацый, у ліку якіх салігорскія «Купалінка» і «Калінка», Беларускі металургічны завод, Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, і іншыя. Падключаюцца вядучыя банкі краіны і прадпрыемствы сацыяльнай абароны, — расказаў Валерый Кавалькоў.

Як адзначыла **намеснік дырэктара па медыцынскай экспертызе і рэабілітацыі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» Венера СЕМЯНЧУК**, у Беларусі створаны ўсе ўмовы для нараджэння і выхавання дзяцей. У сістэме аховы здароўя абазначаны прыярытэт мацярынства і дзяцінства, сфарміраваная рознаўзроўневая сістэма аказання дапамогі парадзісе і немаўляці, наладжана сістэма прафілактыкі абортаў, забяспечана выходжванне немаўля, у тым ліку і з экстрэмальна нізкай масай цела.

### Беларусь у топ-25 самых камфортных для мацярынства краін

Наша краіна займае 25-ю пазіцыю ў рэйтынгу самых камфортных для мацярынства краін і ўваходзіць у 50 найлепшых краін па вядзенні цяжарнасці і арганізацыі вядзення родаў. Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы амаль 100 % жанчын маюць доступ да дародавага і пасляродавага медыцынскага абслугоўвання высокакваліфікаваным медыцынскім персаналам. Дарэчы, сярэдні такі паказчык у свеце складае 71 %.

Сёння 97 % будучых матуль становяцца на ўлік па цяжарнасці да 12 тыдняў, і дадзены скрынінг дазволіў выявіць каля 1500 пароктаў развіцця на прэнатальным этапе. У рэйтынгу краін па эфектыўнасці сістэмы аховы здароўя наша сістэма займае 35-е месца.

Дзяржава гарантуе правядзенне адной бясплатнай спробы экстракарпаральнага апладнення (ЭКА) у дзяржаўных установах аховы здароўя. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта яна праводзіцца парам, якія маюць медыцынскія паказанні пры адсутнасці супрацьпаказанняў, калі ўзрост жанчыны не перавышае 40 гадоў.

У 2020 годзе такіх цыклаў ЭКА было выканана 1887, у выніку чаго наступіла 663 цяжарнасці. За бягучы перыяд гэтага года выканана 1006 поўных цыклаў, наступіла 410 цяжарнасцяў, эфектыўнасць працэдуры — 40,6 %. Дзяржаўныя расходы на гэтыя мэты ў 2022-м і 2023 годзе склалі 12 мільёнаў рублёў.

Выконваецца і комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на змяншэнне колькасці штучнага перарывання цяжарнасці. Сёння закон прадугледжвае правядзенне абавязковага перадабортнага псіхалагічнага кансультавання. Ахоп ім з 2008 года складае 100 %. У выніку за 2021—2022 гады ўдалося захаваць больш за 100 тысяч цяжарнасцяў. А за апошнія 10 гадоў узровень абортаў знізіўся ў два разы. Эфектыўнасць перадабортнага кансультавання складае каля 33 %.

### Колькасць дзяцей-сірот зменшылася амаль на трэць

Як расказала **дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Таццяна БЯЛЕВІЧ**, за апошнія 25 гадоў колькасць дзяцей-сірот зменшылася на 27 %. Колькасць дзяцей у інтэрнатных установах зменшылася амаль у шэсць разоў. Адпаведна сетка дзіцячых інтэрнатных устаноў толькі ў сістэме адукацыі скарацілася амаль у чатыры разы (іх стала менш на 122 адзінкі). А ў тых установах, што засталіся, умовы набліжаныя да дамашніх.

З 2002 года больш чым у шэсць разоў удалося скараціць колькасць дзяцей-адмоўнікаў. Па выніках 2022 года 77 % дзяцей, якія знаходзіліся ў сацыяльна небяспечным становішчы, былі зняты з гэтага ўліку ў сувязі з нармалізацыяй сітуацыі ў сям'і. У 2022 годзе бацькі ў адносінах да 157 дзяцей змаглі аднавіцца ў сваіх правах. Адметна, што сёння пры аднаўленні ў правах суды ўлічваюць розныя меркаванні — прадстаўнікоў сістэмы адукацыі, працоўнага калектыву, кіраўніцтва прадпрыемства, а таксама меркаванне дзяцей.

Калі дзеці застаюцца без бацькоў, першачарговай задачай з'яўляецца ўладкаванне іх на выхаванне ў замяшчальныя сем'і. Сёння ў такіх сем'ях знаходзіцца амаль 85 % дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Натарыус для шматдзетных

## З 13 да 20 кастрычніка беларусы змогуць атрымаць бясплатныя прававыя кансультацыі

**Шматдзетныя бацькі і сужэнцы, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, 13 кастрычніка могуць атрымаць бясплатныя юрыдычныя кансультацыі ў рамках дабрачыннай рэспубліканскай акцыі, прымеркаванай да Дня маці і Дня бацькі, ва ўсіх натарыяльных бюро і канторах Беларусі. А Галоўнае ўпраўленне юстыцыі Мінгарвыканкама цягам тыдня кожны дзень чакае грамадзян на прамых тэлефонных лініях.**

На працягу рабочага дня 13 кастрычніка спецыялісты натарыяльных бюро і кантор усёй Беларусі адкажуць на пытанні, якія ўваходзяць у іх кампетэнцыю. Натарыусы патлумачаць, як скласці і засведчыць пагадненне аб дзецях, шлюбны дагавор, пагадненне аб выплаце аліментаў. Падкажуць, як аформіць спадчынныя правы, скласці завяшчанне або здзейсніць здзелку па набыцці-продажы-адчужэнні нерухомасці.

Тым не менш, як паказвае практыка, большасць зваротаў у гэты дзень датычыцца менавіта шлюбна-сямейных стасункаў.

— Такія мерапрыемствы па прававой асвеце, прымеркаваныя да дзяржаўных свят і памятных дат, традыцыйныя для натарыяльнай суполкі. Іх мэта — забяспечыць абарону правоў і інтарэсаў грамадзян, павысіць узровень прававой свядомасці, культуры і адукаванасці людзей, — заўважыў **Юрый ЛУКАШЭВІЧ, прэс-сакратар Беларускай натарыяльнай палаты.** — Шмат пытанняў, якія вельмі цікавяць сем'і, датычацца, напрыклад, мацярынскага капіталу.

Што датычыцца пагаднення аб дзецях, то тут натарыусы дапамогуць разабрацца з памерамі аліментаў і іншых выплат на малых; вызначыцца, з кім дзеці будуць пражываць; абазначыць парадак выезду непаўналетніх за мяжу. Атрымаць грунтоўныя адказы ад натарыусаў можна і наконт шлюбнага дагавора: калі яго лепш скласці, што ў ім абазначыць, ці можна ўнесці ў дакумент змены альбо ўвогуле пасля скасаваць яго.

Поўны спіс натарыяльных кантор і бюро краіны, а таксама кантакты і час работы натарыусаў можна знайсці на сайце БНП https://belnotary.by/ у раздзеле «Знайсці натарыуса».

Натарыусы, адвакаты, работнікі ЗАГСаў і прадстаўнікі органаў прымусовага выканання цягам тыдня з 13 да 20 кастрычніка кожны дзень з 9.00 да 13.00 чакаюць званкоў грамадзян. Тэму, імя спецыяліста і нумар тэлефона для бясплатнай кансультацыі можна даведацца на сайце Галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінгарвыканкама.

**Ірына СІДАРОК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Менш чым за месяц дзяржаўны доўг ЗША ўзрос на $500 млрд



Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на Міністэрства фінансаў Злучаных Штатаў. У сярэдзіне верасня дзяржаўны доўг краіны перавысіў $33 трлн. Ужо тады гэтую суму назвалі рэкорднай. Паводле апошніх даных, на цяперашні момант паказчык дасягнуў $ 33,513 трлн. Заканадаўча ўстаноўленая мяжа дзяржаўнага доўгу ЗША была перавышана ў студзені, дасягнуўшы сумы ў $31,4 трлн. У наступныя некалькі месяцаў Белы дом заклікаў Кангрэс павысіць кантрольны паказчык. Аднак рэспубліканцы былі згодныя пайсці на гэта толькі ў выпадку скарачэння расходаў бюджэту. Ухвалены Кангрэсам законапраект аб дзярждоўгу быў падпісаны прэзідэнтам ЗША Джо Байдэнам толькі 3 чэрвеня. Згодна з дакументам, ліміт будзе дасягнуты 2 студзеня 2025-га. На думку Байдэна, такі ход дазволіць прадухіліць эканамічны крызіс у краіне.

### У Германіі працягваецца спад прамысловай вытворчасці



Усё больш доказаў цяжкага становішча эканомікі Германіі, якая перажывае цяпер не самыя лепшыя часы. Як паведаміла нямецкае ўпраўленне статыстыкі Destatis, жнівень стаў чацвёртым месяцам запар спаду прамысловай вытворчасці ў ФРГ, паведаміў expert.ru. У канцы лета ў першай эканоміцы Еўропы быў зафіксаваны спад у 0,2 працэнта. Негатыўны тон у прамысловасці задавалі ў жніўні таксама, зрэшты, як і раней, будаўніцтва і энергетыка. Індэкс прамысловай вытворчасці ў апошнім летнім месяцы стаў сёлета самы нізкі. Чакаецца спад і па выніках трэцяга квартала. Эканамісты прагназуюць у ліпені—верасні спад на 0,1 працэнта, а па выніках усяго года — на 0,6 працэнта. Кіраўнік Еўрапейскага цэнтрабанка Крысцін Лагард прызнала, што слабасць першай эканомікі кантынента, вядома, адбіваецца на ўсім Еўрасаюзе.

### Nissan адмовіцца ад продажу ў Еўропе неэлектрычных машын




Японскі аўтавытворца Nissan Motor Co. мае намер да 2030 года поўнасцю спыніць продаж у Еўропе неэлектрычных аўтамабіляў, замяніўшы іх на электракары і гібрыды, паведаміла Financial Times. Прычым з гэтага моманту ўсе новыя мадэлі машын, якія плануецца прадаваць у рэгіёне, будуць аснашчаны выключна электрычным рухавіком альбо электраматорам у спалучэнні з рухавіком унутранага згарання. «Цяпер шляху назад няма», — заявіў генеральны дырэктар Nissan Макота Учыда. Дарэчы, Nissan не адзіны аўтавытворца, які плануе засяродзіцца на продажы аўтамабіляў з электрычным рухавіком. Так, французскі канцэрн Renault, шведская кампанія Volvo Car, а таксама еўрапейскія падраздзяленні Ford Motor і Stellantis збіраюцца дасягнуць поўнай электрыфікацыі мадэльнай лінейкі да канца гэтага дзесяцігоддзя.

# Тэхналогіі, здольныя змяніць наша жыццё

### РАШЭННІ — ЗА ЛІЧАНЫЯ ХВІЛІНЫ

— Па імклівасці развіцця са штучным інтэлектам могуць спаборнічаць хіба што толькі біятэхналогіі. Сёння ўсе тэхнічныя сістэмы і ўсе галіны абапіраюцца на дасягненні ў галіне штучнага інтэлекту, — падкрэсліў падчас урачыстага адкрыцця выстаўкі **Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ**. — Мы назіраем, як стараюцца бязлюдныя вытворчасці, як штучны інтэлект стварае творы мастацтва, музыкі, літаратуры... Многія баяцца, што раней ці пазней, але штучны інтэлект перасягне чалавечы, а чалавек у выніку стане яго рабом. Я такую думку не падзяляю. Усё залежыць ад таго, якую праграму задасць чалавек. Штучны інтэлект павінен служыць нам на карысць. Мы вельмі рады, што гэты форум ужо становіцца брэндам Акадэміі навук. На другой па ліку выставе можна ўбачыць, што было зроблена за апошні год, наколькі мы прасунуліся ў тых ці іншых сферах. Хачу запэўніць, што ў Нацыянальнай акадэміі навук сфарміраваны настолькі магутны патэнцыял, што мы можам вырашаць задачы любой складанасці ва ўсіх галінах.

Спонсарам выстаўкі выступіў ААТ «БПС-Сбербанк». **Намеснік старшыні праўлення банка Андрэй САЎЧАНКА** паведаміў, што цяпер каля 70 працэнтаў працэсаў унутры банка ўключаюць тэхналогіі штучнага інтэлекту: «Мы прайшлі вялікі шлях ад нейкіх кропкавых праектаў, дзе выкарыстоўваліся элементы штучнага інтэлекту, да цяперашняга ўзроўню, калі ў банку штучны інтэлект удзельнічае ў прыняцці ключавых рашэнняў, якія раней прымаў толькі чалавек. Напрыклад, які прадукт і калі прадставіць кліенту, як выбудаваць аптымальны маршрут для інкасатараў і гэтак далей. На 50 працэнтаў запытаў, што паступаюць у наш цэнтр калектыўнага карыстання, адказвае штучны інтэлект. 90 працэнтаў рашэнняў аб спажывецкім крэдытаванні прымаецца без удзелу чалавека, і калі раней для таго, каб даць кліенту адказ, патрабавалася два-тры дні, то цяпер мы гэта робім за дзве хвіліны. У карпаратыўным крэдытаванні рашэнні прымаюцца не за тыдні, а за гадзіны. І мы шчыра лічым, што за штучным інтэлектам — будучыня...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*





Фота Лізаветы ГОЛАД.

### НА СУВЯЗІ — АЛЕСЬ І ВАСІЛІНА

Галоўны арганізатар выстаўкі — Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН Беларусі — прадставіў самыя апошнія распрацоўкі ў галіне штучнага інтэлекту, медыцыны, біяінфарматыкі, робататэхнікі і маўленчых тэхналогій. Адна з навінак — «Платформа штучнага інтэлекту BELAI.BY». Мэта праекта — сабраць на адзіным партале пад эгідай НАН Беларусі айчынныя і замежныя кампаніі, каманды і індывідуальных распрацоўшчыкаў у галіне штучнага інтэлекту, выбудаваць агульную палітыку іх работы ў гэтай прадметнай галіне. Ахвотныя могуць зайсці на платформу і зарэгістравацца ў якасці ўдзельніка. Платформа прызначана для таго, каб аб'яднаць намаганні. Каб укараненне сістэм штучнага інтэлекту было не «лапікавым», а сістэмным.

Таксама платформа змяшчае інфармацыю пра навуковыя (навукова-тэхнічныя, навукова-практычныя) мерапрыемствы, якія праводзяцца па праблемах штучнага інтэлекту і інтэлектуальных тэхналогій.

Варта адзначыць яшчэ адну распрацоўку інстытута — галасавы AI-асістэнт, які ўяўляе сабой платформу з пытальна-зваротнымі сістэмамі на беларускай мове, у аснову якіх пакладзены тэхналогіі сістэм распазнання і сінтэзу маўлення, дыялогавых сістэм. За кошт выкарыстання штучнага інтэлекту пытальна-адказная сістэма дае магчымасць атрымліваць хуткія, якасныя і дакладныя адказы на самыя розныя пытанні. У выніку штодзённага навучання галасавы асістэнт можа як адказаць вам на сур'ёзны запыт пра навуку, так і зрабіць забаўную прапанову. Запыты — як галасавыя, так і тэкставыя. Выбіраем і суразмоўніка: Алесь, Алеся, Алена, Барыс, Кірыл, Васіль ці Васіліна. Кожная з прапанаваных сістэм мае імя, што ачалавечвае яе, і ў карыстальніка ствараецца ўражанне размовы з рэальным чалавекам. Для зручнасці на дадзены момант актываваныя дамены asistent.by, асістэнт.бел і асистент.бел. У хуткім часе плануецца дадаць у памочнік таксама англійскую, рускую і кітайскую мовы, прапанаваць некалькі тыпажоў для асістэнта, напрыклад, «вучоны», «дызайнер», «бізнесмен»... На бягучы момант галасавыя асістэнты даступныя ў фармаце тэлеграм-ботаў, дадаткова вядуцца работы па распрацоўцы Web, iOS і Android версіі асістэнта для больш зручнага карыстання.

### МАШЫННЫ ЗРОК... ДЛЯ БУЛЬБЫ

Цікавая распрацоўка — «Штучны нейрон» — прадстаўлена на выстаўцы Інстытутам фізікі НАН Беларусі імя Б.Сцяпанава. Штучны імпульсны нейрон на аснове оптаэлектроннай пары «вертыкальна-выпраменьвальны лазер — аднафатонны лавінны фотадыёд» прызначаны для распрацоўкі і мадэлявання штучных імпульсных нейронавых сетак трэцяга пакалення шырокага прымянення.

— Інавацыйнасць нашай распрацоўкі ў тым, што ў гэтай тэхналогіі нейрон працуе па аналогіі з чалавечым мозгам, але ён больш энергаэфектыўны, чым біялагічны нейрон, і ў мільёны разоў больш хуткі, — патлумачыў **малодшы навуковы супрацоўнік інстытута, аспірант Мікіта ЛАХМІЦКІ**. — Цяпер мы даследуем уласцівасці нейрона і на аснове атрыманых ведаў будзем ствараць нейронную сетку.

Макет аўтаматычнай бульбасартавальнай машыны прадставіў увазе наведвальнікаў Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі. Машына прызначана для аддзялення некандыцыйных клубняў бульбы на стадыі перадпродажнай падрыхтоўкі ў аўтаматычным рэжыме з дапамогай сістэм машыннага зроку і аўтаматычнай інспекцыі. На рамянным канвееры клубень робіць поўны абарот вакол сваёй восі для вызначэння знешніх дэфектаў. Сістэма машыннага зроку распазнае на знешняй паверхні клубняў сляды пазелянення, захворванняў, механічныя пашкоджанні, нарасты, чарвяточыны і ідэнтыфікуе клубні з гэтымі дэфектамі як некандыцыйныя, пасля чаго выдаляе іх з канвеера струменем сціснутага паветра.

НПЦ НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі знаёміў гасцей форуму з Праграмна-апаратным комплексам сістэмы ідэнтыфікацыі і кантролю фізіялагічнага стану жывёлін.

— Гэта распрацоўка забяспечвае цэнтралізаваны камп'ютарны ўлік і сістэматызацыю параметраў, кантроль над фізіялагічнымі паказчыкамі кожнай жывёліны ў статку, спрашчае зоатэхнічны аналіз, — патлумачыла сутнасць **навуковы супрацоўнік цэнтра Юлія РАГАЛЬСКАЯ**. — Кругласутачны маніторынг ажыццяўляецца з дапамогай транспондара, які замацоўваецца на шыі і вызначае не толькі рухі каровы, але і яе агульны стан. Звесткі аб актыўнасці транспондар перадае на прыёмнік. Усе яны захоўваюцца ў памяці. Пры паступленні новых звестак тыя параўноўваюцца з гісторыяй актыўнасці каровы для вызначэння магчымых змяненняў у яе паводзінах. У выпадку калі вынікі вымярэнняў паказваюць, што карова ўступіла ў перыяд палавога палявання, сістэма апавяшчае пра гэта фермера. Усе даныя аб актыўнасці каровы не менш чым за тры апошнія месяцы можна паглядзець у праграме «Майстар» на камп'ютары ў выглядзе графікаў і табліц.

### КОСМАС — НА СУВЯЗІ

У раздзеле «Адукацыйныя тэхналогіі» наведвальнікі выставы змаглі азнаёміцца з макетам касмічнага нанаспадарожніка BSUSat-2, які быў паспяхова выведзены на арбіту 27 чэрвеня 2023 года. Запуск другога ўласнага нанаспадарожніка стаў вынікам пяцігадовай работы супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ. Па тэхнічных і тэхналагічных параметрах «BSUSat-2» перасягнуў першы апарат. Ён важыць каля трох кілаграмаў і ў адрозненне ад свайго папярэдніка большы па памерах — 30×10×10 см. Усе асноўныя кампаненты і сістэмы зроблены ў Беларусі.

Другі спадарожнік уяўляе сабою ўніверсальную лётную платформу модульнага тыпу з аб'яднальнай мацярынскай платформай, каркасам, службовымі модулямі асноўных бартавых падсістэм для энергазабеспячэння, радыёсувязі, кіравання, арыентацыі і стабілізацыі і наборам модуляў карыснай нагрузкі пад пэўныя навуковыя і практычныя задачы. Апарат таксама абсталяваны ўнікальнымі сонечнымі батарэямі, устойлівымі да касмічнай радыяцыі. Акрамя таго, у адрозненне ад першага спадарожніка ў «BSUSat-2» сістэма кіравання цалкам мадэрнізаваная, устаноўлены дзве новыя камеры высокай дакладнасці і дадатковыя каналы сувязі. Абодва ўніверсітэцкія спадарожнікі пралятаюць над тэрыторыяй Беларусі шэсць разоў у суткі, знаходзячыся ў зоне радыёбачнасці 10-11 хвілін. За гэтыя кароткія інтэрвалы можна прыняць інфармацыю тэлеметрыі і мэтавай нагрузкі.

### ЭТЫЧНЫЯ ПЫТАННІ

У рамках форуму адбыўся круглы стол, дзе абмяркоўваліся прававыя і маральныя аспекты рэгулявання прымянення тэхналогій штучнага інтэлекту, а таксама пасяджэнне Экспертнага савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Рэгіянальнай садружнасці ў галіне сувязі.

«Укараненне штучнага інтэлекту ў СНД будзе ўрэгулявана законам, — праінфармаваў журналістаў **генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей КРУГЛІКАЎ**. — Мы будзем дакладваць аб першым этапе распрацоўкі мадэльнага закона аб штучным інтэлекце для краін СНД. Наш інстытут у гэтым годзе выйграў конкурс на распрацоўку праекта закона і быў вызначаны галаўной арганізацыяй. У Расійскай Федэрацыі ўжо прыняты Кодэкс этыкі штучнага інтэлекту. Наш інстытут і шэраг беларускіх арганізацый далучацца сёння да гэтага кодэкса. Але этыка — этыкай (на яе можна і вочы заплюшчыць), а закон аб штучным інтэлекце — проста неабходны. Гэта правілы ўкаранення штучнага інтэлекту ў жыццядзейнасць чалавека, якіх усе абавязаны будуць прытрымлівацца, іх нельга будзе парушыць».

Таксама ў першы дзень работы форуму адбылося ўзнагароджанне пераможцаў адкрытага конкурсу «Лідары штучнага інтэлекту Беларусі». Ён праводзіўся ў нашай краіне ўпершыню па трох намінацыях: «Кампанія — лідар штучнага інтэлекту Беларусі»; «Праект — лідар штучнага інтэлекту Беларусі» і «Прадукт — лідар штучнага інтэлекту Беларусі». Пераможцам у намінацыі «Кампанія — лідар штучнага інтэлекту Беларусі» стаў Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Сугучча

## ПАМЯЦЬ — НА ЎСЕ СТАГОДДЗІ

**У Мінску працягваюцца Дні башкірскай літаратуры ў Беларусі. Паэты, празаікі з Уфы разам з беларускімі калегамі наведаліся ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дзе пазнаёміліся з экспазіцыяй гераічнай, драматычнай памяці пра гады ліхалецця, а таксама правялі круглы стол, звязаны з гераіка-патрыятычнай тэмай у літаратуры.**

Размову пра супольныя адрасы ваеннай памяці распачаў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч. Ён нагадаў пра воінаў-башкартастанцаў, якія ваявалі на Гомельшчыне і Віцебшчыне, на Магілёўшчыне і Міншчыне, у іншых старонках нашай краіны. Кранальным атрымалася выступленне старшыні Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Башкартастан Айгіза Баймухаметава. Ён расказваў пра башкірскіх пісьменнікаў, якія ваявалі ў Беларусі. А яшчэ падзяліўся ўласнай сямейнай гісторыяй — пра дзеда, які ваяваў у нашай краіне. А пасля падобныя гісторыі расказалі і іншыя башкірскія паэты, празаікі... Блізкі родзіч уфімскага празаіка Святланы Чураевай загінуў у Брэсцкай крэпасці ў першыя ж дні. Сляды так і не знойдзены. Святлана разам са сваімі дзецьмі прыязджала і раней у Беларусь, у Брэст, пакланілася тым сценам, тым руінам, якія, відаць, трымаюць памяць і пра яе прашчура. І бацька паэтэсы Зульфіі Хананавай прайшоў шляхамі вызвалення па беларускіх сцежках-дарожках. «Мо таму ў мяне такая прывязанасць да сінявокай беларускай старонкі, дзе столькі знаёмых паэтаў, перакладчыкаў, дзе я пабывала ўжо неаднойчы», — заўважыла Зульфія. З падрабязным расповедам пра баявую гісторыю 112-й Башкірскай кавалерыйскай дывізіі, якая вызваляла Мазыр, удзельнічала ў Гомельска-Рэчыцкай вайсковай аперацыі, выступіў беларускі публіцыст, палітолаг, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі Уладзімір Макараў.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Неаднойчы ў час круглага стала гучала імя башкірскага паэта Зіната Куціпа (1918—1944), які загінуў на тэрыторыі Беларусі ў ліпені 1944 года. На вялікі жаль, месца яго пахавання невядомае. Яшчэ ў 1939 годзе Зінат Куціп выдаў ва Уфе паэтычны зборнік для дзяцей — «Вершы», куды ўвайшлі і яго творы пра барацьбу іспанскага народа з фашызмам. Несумненна, беларускія і башкірскія літаратары аказаліся аднадушнымі ў тым, што неабходна знайсці тую брацкую магілу, дзе пахаваны паэт. А мо і варта заснаваць Літаратурную прэмію імя Зіната Куціпа для адзнакі творчасці маладых паэтаў?.. І, канешне ж, варта выдаць вершы слаўнага сына башкірскага народа ў перакладзе на беларускую мову. Як і творы іншых паэтаў, пісьменнікаў, якія ваявалі ў Беларусі. Такая кніга стане сапраўдным помнікам людзям, якія не шкадавалі сваіх жыццяў у барацьбе з фашызмам.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Сядзі і глядзі

# СВЯТА Ў КОЛЕ РОДНЫХ

**На тэлеканале «Беларусь 2» у новым сезоне стартавала маштабнае гульнявое шоу «Гэта мая сям'я», дзе кожныя выхадныя дзве каманды змагаюцца за званне пераможцаў. І найбліжэйшыя выпускі, якія супалі са святочнымі датамі, не стануць выключэннем.**

Так, 14 кастрычніка — у Дзень маці — удзел прымуць дзве шматдзетныя сям'і: Валчэцкіх з аграгарадка Жамчужны і Грудзінскіх з аграгарадка Макраны Брэсцкай вобласці. Удзельнікам абедзвюх каманд патрэбна будзе справіцца з пяццю вясёлымі конкурсамі на ўзаемавыручку і кемлівасць, каб атрымаць у выніку званне самай дружнай і згуртаванай сям'і. А ў Дзень бацькі, 21 кастрычніка, цёплыя віншаванні ад удзельнікаў шоу прыме вядучы праекта шматдзетны тата Яўген Шуманскі.



Фота Белтэлерадыёкампаніі.

— Сёння не ва ўсіх краінах сям'я застаецца галоўнай каштоўнасцю. Мы ганарымся, што ў нашай дзяржаве шмат увагі аддаецца ўмацаванню інстытута сям'і. А праект гэты чарговы раз пацвярджае, што беларускія сем'і — самыя моцныя і дружныя, — адзначае **прадзюсар шоу Герман МАЛЫШЫЦКІ**. — Галоўная мэта праграмы не ў тым, каб змусіць каманды спаборнічаць. Зусім наадварот — мы хочам, каб удзельнікі весела правялі час у коле сваіх родных людзей. І таму без каштоўнага падарунка здымачную пляцоўку ніхто не пакідае. А дорым мы нашым удзельнікам сертыфікаты на выхадныя мары.

Нагадаем, за прыгодамі ўдзельнікаў шоу гледачы могуць сачыць кожную суботу на тэлеканале «Беларусь 2». Праект «Гэта мая сям'я», у якім возьмуць удзел 104 моцныя сям'і з усёй краіны, дакажа вядучаму і тэлеаўдыторыі, што толькі разам можна пераадолець любыя выпрабаванні.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ

(«Звязда») Выпуск № 202

Першая ліга чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па шашках-100 праходзіла з 25 верасня да 1 кастрычніка ў Мінску.

У мужчынскім турніры сярод 26 удзельнікаў на старт выйшлі дзве жанчыны — майстры спорту — Вера Хвашчынская і Вікторыя Белая. Яны здолелі даць бой мужчынам, і Вера з вынікам 13 балаў з 18 стала пераможцай турніру. Трэба адзначыць, што ёй ужо раней атрымлівалася выйграваць першую лігу па шашках-64 сярод мужчын. Вікторыя з 11 ачкамі стала пятай. Пуцёўкі ў вышэйшую лігу таксама атрымалі Павел Лагуткоў, Данііл Лапчук — па 13 ачкоў, Сцяпан Дарашэнка — 12 ачкоў. У жанчын павышэнне ў класе атрымалі Яўгенія Швед, Ксенія Белая па 14 ачкоў. Марына Наўроцкая — 12 ачкоў. Анастасія Сакалова і Алеся Масюк — па 11 ачкоў.

**№ 155** В. Хвашчынская — У. Чайкоўскі

**Белыя простыя:** 46, 47, 48, 49, 42, 43, 45, 36, 37, 38, 39, 40, 31, 32, 33, 34, 35, 25 (18)

**Чорныя простыя:** 26, 23, 16, 18, 19, 20, 11, 12, 13, 14, 6, 7, 8, 9, 1, 2, 3, 4 (18)

1. 33-29 16-21 2. 35-30 11-16 [ 2...04-10 3.29-24 20:29 4.25-20 14:25 5.32-28 23:41 6.34:05+]

3. 47-41 21-27 4. 32:21 16:27 5. 31:22 18:27 6. 29:18 12:23 7. 34-29 23:34 8. 40:29 04-10 9. 29-23 19:28 10. 37-31 26:37 11. 42:33 +

**№ 156**



Усе сённяшнія кампазіцыі складзены вядучым рубрыкі.

**№ 156** Віталь Варушыла.

**Белыя простыя:** d2, h4, e5, g5, d6, h6 (6)

**Чорныя простыя:** f2, h2, g3, g7, d8, f8 (6)

**№ 157**

**Белыя простыя:** e1, g1, e3, g3, f4, g5 (6)

**Чорныя простыя:** b2, h2, a3, c5, e7, g7 (6)

**№ 158**

**Белыя простыя:** g1, f2, e3, g3, d4, f4, e5, g5 (8)

**Чорныя простыя:** b2, h2, c3, b4, h4, c5, b6, e7, h8 (9)

**№ 159**

**Белыя простыя шашкі:** e1, d2, g3, c7 (4)

**Чорныя простыя шашкі:** f2, d4, h4, f6, h6, b8 (6)

Астатнія кампазіцыі складзеныя па правілах бразільскіх шашак.

**№ 160**

**Белыя простыя:** f2, h2, c3, e3, g3, c5 (6)

**Чорныя простыя:** h4, e5, g5, c7, e7, g7 (6)

**№ 161**

**Белыя простыя:** a3, e3, f4, h4 (4)

**Чорныя простыя:** b4, c5, e5, d6, f8 (5)

**№ 162**

**Белыя простыя:** b2, f2, a3, g3, a7, g7 (6)

**Чорныя простыя:** a5, e5, d6, f6, b8, f8, h8 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваны.

**Праверце свае рашэнні:** Выпуск № 201 ад 29.09.2023.

№ 147 1. g3-f4 e5:e1 2. g5-f6 g7:e5 3. g1-f2 e1:g3 4. h2:d6 c5:e7 5. a7:c5 e7-f6 6. c5-d6+

№ 148 1. 24-20 38:29 2. 26-21 17:28 3. 30-24 22:31 4. 24:04 15:24 5. 04:16 +

№ 149 1. 23-18 13:44 2. 17-12 40:20 3. 25:03 08:17 4. 03:50+

№ 150 1. 17-11 07:27 2. 18:07 27:29 3. 33:02 36:47

[ 3...01:12 4. 28-23 36:47 5. 23-19 47:13 6. 02:04 ] 4. 02-24 47:30 5. 35:04+

№ 151 1. d6-e7 f8:b4 2. a5:g3 a7:c5 3. h6:f8 h2:f4 4. f8:b4 f4-g3 5. b4-c5 g3-h2 6. c5-g1+

№ 152 1. c5-d6 c7:g3 2. h2:f4 a3:c5 3. e3-d4 c5:g5 4. h4:d8+

№ 153 1. e3-d4 a3:g5 2. h4:h8 c5:e3 3. e5-d6 c7:e5 4. h8:g1 +

№ 154 1. d2-c3 e5:e1 2. c3:c7 b8:d6 3. b2-c3 e1:b4 4. a3:e7 f8:d6 5. a7-b8 d6-c5 6. b8-e5+

Першыя дакладныя адказы даслалі: Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# УСЁ ДЛЯ МАМЫ

**Дзень маці на сацыякультурным тэлеканале таксама будзе мець святочныя акцэнты. Тут гледачоў чакае паказ кіно і канцэртная праграма ўвечары.**

Раніцай можна ўсёй сям'ёй паглядзець мастацкі фільм «Мама» Элізабеты Бостан. Музычная кінастужка савецка-румынска-французскай вытворчасці ўбачыла свет у 1976 годзе, знялі яе па матывах казкі «Воўк і сямёра казлянят». Праўда, у самім фільме іх стала пяцёра. Паколькі фільм з'явіўся ў выніку міжнароднага супрацоўніцтва, то і выйшаў ён на трох мовах: рускай, румынскай і англійскай, прычым кожная сцэна пераздымалася асобна на кожнай мове.

У ролі Шэрага Ваўка там зняўся па рашэнні рэжысёра Міхаіл Баярскі, але спрабаваўся на яе першапачаткова акцёр Мікалай Карачанцаў. А вось Казумаму на экране ўвасобіла Людміла Гурчанка. Актрыса падчас здымак на катку сутыкнулася з Алегам Паповым і зламала нагу, здымалася ў гіпсе. Таму спачатку працавалі над сцэнамі, дзе Людмілу Маркаўну можна было не паказваць у поўны рост, а ў некаторых эпізодах муж артысткі Канстанцін Купервейс нават падтрымліваў яе за талію.

Што да музычнага складніка кінастужкі, то ў рускай версіі галоўныя героі (Воўк і Каза) спяваюць самі, а дзяцей агучвае Клара Румянава. Вакал у румынскай версіі прадубліраваны ў адрозненне ад англійскай версіі, дзе акцёры не спяваюць і не гавораць сваімі галасамі. Як успамінаў Міхаіл Баярскі, савецкая версія атрымалася не падобнай на варыянты на замежных мовах, таму што калі, напрыклад, па-англійску кожная сцэна здымалася па пяць-шэсць дубляў, то для работы па-руску заставалася заўсёды мала часу. І працаваць даводзілася з аднаго дубля. Манціравалі фільм таксама асобна ў кожнай краіне, у выніку чаго маюцца адрозненні ва ўсіх трох фільмах нават там, дзе акцёры нічога не гавораць і не спяваюць. Прэм'ера кінастужкі ў Румыніі адбылася ў лістападзе 1976 года, а ў СССР яна з'явілася на экранах толькі 17 кастрычніка 1977 года. У тэлеэфіры ж яе ўвогуле паказалі толькі ў 1980 годзе. Разам з тым фільм атрымаў спецыяльны прыз журы на XXIX Міжнародным кінафестывалі для дзяцей і моладзі ў Венецыі (1977 г.). А ў Нарвегіі кінагісторыя стала настолькі папулярнай, што нават была створана яе тэатральная версія. Таму не прапусціце паказ «Мамы» ў суботу на тэлеканале «Беларусь 3».

А ў вячэрнім эфіры сацыякультурнага нас чакае паказ канцэрта Маладзёжнага тэатра эстрады «Хіты для мам». Атмасферу свята гледачам падораць вядомыя артысты беларускай эстрады: Жанэт, Аляксандр Сухараў, Ганна Благава, Гюнеш, Аляксандра Гайдук... Дададуць непаўторных фарбаў канцэртнай праграме таксама і выступленні любімых многімі калектываў, сярод якіх ансамбль «Песняры», «Верасы», шоу-тэатр «Хвілінка» і іншыя.

**Алена ДРАПКО.**

Далучайцеся!

## НАВІНКІ ТЭЛЕКАНАЛА АНТ

